706_632.qxd 12/1/2024 10:28 AM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Электронны адрас: viestki@mail.com
✉ P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 12 (706)
Сьнежань 2024 г.


## Рада Беларускае Народнае Рэспублікі

### Зварот да Дня Герояў (гадавіны Слуцкага Збройнага Чыну)

Дарагія Суродзічы!

У гэтыя 104-я ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну, калі наш народ выйшаў бараніць Беларускую Народную Рэспубліку ад бальшавіцкай навалы, хачу – як і кожны год – выказаць удзячнасьць слуцкім героям.

70 гадоў савецкага ладу зьмянілі наш народ. Не ў галаве было думаць пра волю, незалежнасьць і нашыя адвечныя беларускія карані. Трэба было выжыць. І дзеля гэтага маўчалі мы і чакалі. Тады гэта рабілі ўсе паняволеныя Масквой народы. Але бальшыня зь іх адрадзіліся. Нашае адраджэньне дзеля розных прычынаў пратрывала толькі тры гады. Дабравольна пайшоў зноў народ у няволю, зь якой ня можа вызваліцца ўжо 30 гадоў.

Дарагія мае Суродзічы, хачу сёньня папрасіць Вас, каб памяталі пра ўсіх тых нашых продкаў, што аддалі жыцьцё, каб жыла Беларусь! На працягу стагодзьдзяў наш народ бараніў сваю зямельку. Памятайма гэта! Наш край не загінуў дзякуючы тым з нас, якія разумелі каштоўнасьць свабоды, І ПАМЯТАЛІ!

А сёньня вельмі важна дапамагчы тым, хто са зброяй у руках абараняе ад расейскага агрэсара Ўкраіну, бо гэта адначасна і змаганьне за незалежнасьць Беларусі. Мы павінны дамагацца вызваленьня беларускіх ваяроў з расейскага палону, неадкладнага вызваленьня былога каліноўца Васіля Верамейчыка, міжнароднага прызнаньня правоў беларускіх вэтэранаў змаганьня з Крамлём і іх сем’яў. Перакананая, што ў будучыні ўлады вольнай Беларусі павінны ўзнагародзіць беларускіх абаронцаў Украіны.

Я веру, што прыйдзе час, калі Бог вызваліць нас ад чужой навалы і сваіх здраднікаў. Магчыма я не дажыву да таго часу, але Вам будзе яшчэ дадзена “людзьмі звацца”!

Дык памажы Вам Божа!!!
Жыве Беларусь!

***Івонка Сурвілла,***
*Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*
*Лістапад 2024 г.*
*Атава*

### Шаноўныя падпісчыкі!

Паведамляем, што наш інфармацыйны бюлетэнь “Весткі й Паведамленьні” прыпыняе свае выданьне, і ў руках вы трымаеце ягоны апошні нумар. Зь цягам часу, разьвіцьцём тэхналёгіяў і шляхоў камунікаваньня паміж сябрамі нашай арганізацыі неабходнасьць у існаваньні такога роду выданьня паціху адпала.

Заснаваны бюлетэнь быў у пачатку 1980-х гадоў тагачасным старшынём нью-ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сп. Алесем Міцкевічам (пляменьнікам клясыка нашай літаратуры) менавіта як сродак сувязі паміж сябрамі арганізацыі. У 1998 годзе, у сувязі з абраньнем на пасаду старшыні нью-ёрскага аддзелу БАЗА, рэдагаваньне “Вестак і Паведамленьняў” пераняў я. У тыя часы выданьне мела трошкі сьціплейшы выгляд і выдавалася два разы на месяц. Ад сакавіка 2002 году бюлетэнь быў часткаю газэты “Беларус”, органу Галоўнай Управы БАЗА, рэдактарам якой мне таксама давялося быць ад сакавіка 2002 да кастрычніка 2010 году. Ад студзеня 2011 году бюлетэнь “Весткі й Паведамленьні” стаў друкаваным органам Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, арганізацыі, што была заснаваная былымі сябрамі нью-ёрскага аддзелу БАЗА пасьля канфлікту з Галоўнай Управай БАЗА. Тады ж на месца нью-ёрскага аддзелу Галоўнай Управай арганізацыі быў створаны бруклінскі аддзел БАЗА, што існуе і да сёньня.

Хачу выказаць удзячнасьць усім падпісчыкам, што падтрымлівалі бюлетэнь цягам гадоў майго рэдагаваньня (1998-2024). Сёньня ў гэта цяжка паверыць, але ёсьць асобы, якія выпісвалі “Весткі й Паведамленьні” цягам усіх гэтых дваццаці шасьці гадоў. Мая ім шчырая падзяка.

***Марат Клакоцкі***

-------------------------------------------




Разам з гэтым нумарам “Вестак і Паведамленьняў” падпісчыкі атрымаюць таксама **каляндар Згуртаваньня “Пагоня” на 2025 год**. Калі нехта захоча мець больш асобнікаў нашага календара, іх можна замовіць на сайце **e-krama.com**

Замовы таксама можна даслаць па пошце на адрас:

***Marat Klakotski***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

Кошта аднаго асобніка разам з дасылкаю ў межах ЗША **$12.**

З пытаньнямі звяртайцеся на емэйл адрас ***viestki@mail.com***

706_632.qxd 12/1/2024 10:29 AM Page 3 (1,1)



# Перамога Рэспубліканскай Партыі – ці стане яна перамогай для цэлай Амэрыкі

5 лістапада 2024 году амэрыканскія выбарцы аддалі свае галасы за кандыдата на прэзыдэнта ЗША, былога прэзыдэнта Дональда Трампа. Гэта былі трэція выбары Трампа, і другія, у якіх ён перамог. У адрозьненьне ад выбараў 2016 году, а тым больш году 2020-га, дасягнутая Трампам і рэспубліканцамі перамога на выбарах ужо не ставіцца пад сумлеў. А вось падзеі вакол выбараў 2020 году сталі адной з найзмрочных зьяваў у найноўшай гісторыі Амэрыкі. З аднаго боку, дэмпартыя, сродкі масавай інфармацыі, палітычныя аглядальнікі й аналітыкі, адукацыйныя і забаўлялныя эліты ўсхвалялі перамогу віцэ-прэзыдэнта Байдэна і праводзілі наймаштабную кампанію дэзынфармацыі, маніпуляцыяў і "гаслайтынгу".



Абгрунтаваныя, дакумэнтальна зафіксаваныя выпадкі фальсыфікацыяў падчас выбараў, парушэньні справядлівасьці, празрыстасьці й дэмакратычнасьці выбараў былі абвешчаныя "тэорыямі змовы", "выдумкамі трампістаў", "спробамі рэспубліканцаў захапіць уладу". Між тым набраўся цэлы корпус сьведчаньняў аб парушэньнях падчас выбараў: адмовы назіральнікам прысутнічаць пры падліку бюлетэняў, шматкротныя прапусканьні бюлетэняў праз падліковыя машыны, падлік паштовых бюлетэняў са штампамі пазьнейшай даты і без штампаў наагул, памылкі машынаў для галасаваньня фірмаў Dominion Voting Systems і Smartmatic, калі дзясяткі тысяч(!) галасоў за Трампа заносіліся пры падліку як пададзеныя за Байдэна, а пасьля пратэстаў назіральнікаў былі перакінутыя назад, маўляў, "проста памылачка выйшла".

Палаты прадстаўнікоў Джорджыі *https://www.youtube.com/watch?v=NVLeI-zEmEQ* і Пэнсыльваніі *https://www.c-span.org/video/?478422-1/pennsylvania-republican-hearing-2020-election* на сваіх слуханьнях адносна выбараў 2020 году праслухалі мноства сьведкаў, аналітыкаў, экспэртаў па выбарах і тэхналёгіях падліку галасоў. Народныя прадстаўнікі ў тых штатах прыйшлі да высновы, што адбываліся масавыя парушэньні. Пра гэта, дарэчы, ужо амаль няма інфармацыі ў сеціве, і не прачытаеш у Вікіпэдыі, што стала новым фарпостам лявацкай ідэалёгіі. Але прадстаўнікі выбарчых камісіяў ды іншыя бюракраты самаўпэўнена заяўлялі, нават пасьля прызнаных памылак у падліку некалькіх тысяч галасоў (гэта тое, што было "злоўлена") – "не маглі паўплываць на вынікі выбараў!" І гэта пры тым, што ў трох "хісткіх" штатах, Арызоне, Пэнсыльваніі й Джорджыі, што вырашылі лёс выбараў, перавага Байдэна склала каля 40 тысяч галасоў, што цалкам рэальна сфальсыфікаваць і адпаведна аформіць.

Пазьней, калі прадстаўнікі Рэспубліканскай партыі падалі зыскі на парушэньні падчас выбараў, амаль усе зыскі былі беспадстаўна адкінутыя. Гэта значыць, судзьдзі прагледзелі гадзіны відэазапісаў, сотні й тысячы пісьмовых сьведчаньняў канкрэтных людзей, грамадзянаў-назіральнікаў, грамадзянаў-выбаршчыкаў і, вокам не міргнуўшы, выкінулі, як сьмецьце, тыя сьведчаньні, дзе людзі пад прысягай былі гатовыя адстойваць, рэалізуючы свае права на дэмакратычныя, справядлівыя і празрыстыя выбары. Напрошваецца пытаньне, ці праглядаліся наагул тыя сьведчаньні, ці не былі яны апрыёры занесеныя ў катэгорыю непрыймальных.

У кожным разе, тая самапэўнасьць левакоў і Дэмпартыі, што ўсчалі кампанію дыскрэдытацыі сьведчаньняў пра парушэньні на выбарах, маўляў гэта інсынуацыі, прыдумкі "скрайне-правых", "праект Бэнана і Qanon" – выклікалі ў адказ контрэакцыю, якая скончылася падзеямі 6 студзеня 2021 году, калі на вачах усёй краіны, у наўпростым этэры некалькі соцень чалавек "правальсіравалі" ў будынак Капітолію, патуляліся там без відавочнай мэты й якіх-кольвечы арганізаваных дзеяньняў, пахадзілі па габінэтах недалёка ад залі, дзе адбывалася пасяджаньне па зацьверджаньні вынікаў, страцілі адну жанчыну застрэленай і пакінулі будынак. Усё гэта нагадвала загадзя падрыхтаваную пастку – і брак сур'ёзных спробаў стрымаць пранікненьне "турыстаў" у будынак, і разгубленая бязмэтавасьць тых людзей, што не чакалі такога лёгка дасягнутага выніку, і галоўнае – быў арганізаваны мэтадычны накат валу абвінавачаньняў у "дзяржаўным перакуле", "спробе захопу ўлады", "злачыннай акцыі Трампа". Усе наступныя дзеяньні кіраўніцтва Дэмпартыі й кіруючых элітаў Амэрыкі, і новыя інфармацыі – як адмова сьпікершы Н. Пэлозі ўзмоцніць ахову Капітолія і далучыць да аховы Нацгвардыю – толькі ўзмоцнілі думкі пра справакаванасьць падзеяў 6 студзеня 2021 году.

Усё гэта яшчэ больш замацавала падзел грамадзтва, што існаваў і раней, але ня быў такі выразны, такі зацяты, такі бескампрамісны. І ня быў так ідэалягічна абгрунтаваны. І вось да ўлады ў краіне зноў прыйшоў чалавек, якога яшчэ 4 гады таму называлі "аранжавы фюрар", "мізагініст", "расіст", "антысэміт". Цяпер яго ўжо не журналісты, а супернікі па выбарах назвалі "фашыстам", "аматарам Гітлера" і "новым Гітлерам".

Краіна застаецца падзеленай роўна палова на палову. Што чакаць ад наступных чатырох год прэзыдэнтцва Трампа? Ведаючы неўраўнаважаную і нецярплівую сутнасьць характару Дональда Трампа, ягоную абмежаванасьць і эгатызм, застаецца спадзявацца толькі на ўраўнаважанасьць, цярплівасьць і кампэтэнтнасьць дарадцаў і сябраў ягонай адміністрацыі. Але гэта таксама стаіць пад пытаньнем, бо выглядае, што ўсе намінанты на асноўныя пазыцыі ў адміністрацыі гэта тыя людзі, каго Трамп пабачыў у тэлевізіі!

З другога боку, зацятасьць і адвага Трампа, наўпросты і адкрыты падыход да праблемаў, "тытанічнасьць" і харызма ягонай асобы даюць шанец пераламаць тэндэнцыю разьвіцьця грамадзтва па задумах леварадыкалаў – убок падвышэньня ролі дзяржавы, залежнасьці ад яе і абмежаваньня самастойнасьці індывіда. Трамп настаўлены стымуляваць рэіндустрыялізацыю Амэрыкі, дасягнуць энэргетычнай незалежнасьці, мінімізаваць рэгуляваньне і кантраляваньне эканомікі, адкінуць адыёзныя пастуляты "кліматычных вяроў", на якія выкідаюцца мільярды народных грошай. Трампу-45 удалося дасягнуць паніжэньня інфляцыі, падвышаньня ўзроўню працоў-

***заканчэньне на бачыне 4***

706_632.qxd 12/1/2024 10:29 AM Page 3 (3,1)



Беларусь – Амэрыка: лёсы землякоў

# Францішь Бартуль - грамадзкі дзеяч і мэцэнат

Францішь Бартуль, беларускі грамадзкі дзеяч, прадпрыймальнік і мэцэнат у ЗША і Вялікай Брытаніі, нарадзіўся ў вёсцы Барозкі Прыдруйскай воласьці 15 лістапада 1918 году. Тое мястэчка ён называў Прыдруйка, не “Прыдруйск” (Piedruja). Гэтыя мясьціны знаходзяцца на этнічна беларускіх землях, беларускіх Інфлянтах (Латгаліі), якія пасьля 1918 году адыйшлі да Латвіі. Францішь паходзіў зь беднай сялянскай сям’і, бацька працаваў парабкам, у сям’і было 6 дзяцей – 5 братоў і сястра. Старэйшы брат Вінцэнт (Валянтын) вучыўся ў Вільні. Францішь паважаў брата і роўніўся на яго. Настаўнікам у Прыдруйскай школе быў паэт і грамадзкі дзеяч Эдвард Вайвадзіш, ён прышчапіў вучням беларускую сьвядомасьць і разуменьне справаў беларускіх. Пасьля, ужо ў нядаўні час, Ф. Бартуль фундаваў выданьне першай кнігі Э. Вайвадзіша. Далёкі сваяк яго, Аўген Бартуль, быў вядомым паэтам у Заходняй Беларусі.

Затым Францішь паступіў у Дзьвінскую беларускую гімназію. Пазьней, калі пачаўся наступ на нелатыскія структуры, Францішь узяўся працаваць, ганяў плыты па Дзьвіне. Затым ён паехаў на заробкі ў Нямеччыну, працаваў на карабельным заводзе, там пашкодзіў сьпіну і мусіў вярнуцца да бацькоў. Францішь добра ведаў нямецкую і расейскую мовы акрамя беларускай і латыскай, таму, калі прыйшлі Саветы, яго прызначылі працаваць перакладчыкам у НКВД. Ён па магчымасьці выкідаў і зьмяняў даносы, што траплялі яму ў рукі. Дарэчы, ён успамінаў, што меў добры гарнітур, што набыў у Нямеччыне, і гэта была цікавостка для энкавэдыстаў, што пыталіся: “А Вы дзійствіцельна сын батрака?” Але дзеля таго што ён ведаў мовы і быў каштоўным кадрам, далей гэтага не пайшло. Калі ў 1941 годзе Саветы ўцякалі, Францішу не хапіла месца, каб эвакуявацца, і яго пакінулі, па яго ных словах, з сапсутым пісталетам “бараніць Родзіну”.

Як прыйшлі немцы, пад уплывам брата, Ф. Бартуль перабраўся ў Вільню і паступіў на настаўніцкія курсы. Потым ён пайшоў на афіцэрскія курсы і, як знаўца моваў, стаў перакладчыкам у Ф. Кушаля. Пасьля працаваў у Беларускім Камітэце ў Кёнігсбэргу, выдаваў дакумэнты беларускім уцекачам. Затым Ф. Бартуль апынуўся ў польскім войску, у корпусе Андэрса. Пасьля капітуляцыі Нямеччыны ў 1945 годзе з дапамогай біскупа Баляслава Слоскана, папскага візытатара для беларусаў-каталікоў,



Ф. Бартуль паступіў на філязофскі факультэт Мюнхэнскага каталіцкага ўнівэрсытэту, адкуль неўзабаве перайшоў у Грыгарыянскі ўнівэрсытэт у Рыме, дзе вывучаў філязофію. Праз нейкі час ён пераехаў у Брытанію, там паступіў вучыцца на зубнога тэхніка, вывучаў дантыстычную тэхналёгію вырабу пратэзаў і адкрыў свой бізнэс. Ён ажаніўся зь беларускай актывісткай Верай Касьцюкевіч, браў актыўны ўдзел у працы Згуртаваньня Беларусаў Вялікай Брытаніі (ЗБВБ), у 1949-50 гг. быў старшынём гэтай арганізацыі. Таксама дапамагаў беларускай грэка-каталіцкай місіі ў Лёндане, якую тады ўзначальваў кс. Чэслаў Сіповіч, які пасьля стаў біскупам. Вакол місіі разгарнулася беларуская культурніцкая справа, было створанае Англа-Беларускае Таварыства, і Францішь Бартуль шмат дапамагаў грашова ў культурніцкіх і грамадзкіх справах беларускай грамады ў Брытаніі. Адным з прыкладаў можа быць фундаваньне ім набыцьця рэдкага друкаванага выданьня Статуту Вялікага Княства Літоўскага. Пазьней на падставе кніжнай і архіўнай калекцыі пры беларускай грэка-каталіцкай місіі паўстала Беларуская бібліятэка і музэй імя Францішка Скарыны (1971 г.).

У 1956 годзе Францішь Бартуль зь сям’ёй пераехаў у Амэрыку. Асеўшы ў Нью-Ёрку, ён атрымаў адпаведныя ліцэнзіі і адкрыў дантыстычны бізнэс па вырабу зубных пратэзаў. Ад самага прыезду Ф. Бартуль браў актыўны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці, у дзейнасьці Рады БНР, Беларуска-Амрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). Ахвяраваў значныя ўласныя сродкі на падтрымку беларускіх арганізацыяў і праектаў, у тым ліку на выдавецкую дзейнасьць Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва (БАНіМ) і выданьне газэты “Беларус”. Францішь Бартуль быў прэзыдэнтам беларускай дабрачыннай арганізацыі – Фундацыі імя Крэчаўскага. Ён актыўна дапамагаў новай хвалі беларускіх імігрантаў у 1990-я і 2000-я гады.

Акрамя шчодрай падтрымкі беларускіх культурніцкіх праектаў і беларускай выдавецкай справы, Францішь Бартуль аказваў значную фінансавую дапамогу Народнаму пісьменьніку Беларусі Васілю Быкаву, калі той быў змушаны выехаць зь Беларусі ў канцы 1990-х гадоў. У доме Ф. Бартуля часта рабіліся прыняцьці з удзелам беларусіх дыгнітароў з новапаўсталай Рэспублікі Беларусь, у тым ліку міністра замежных справаў Пятра Краўчанкі, прадстаўніка ў ААН Генадзя Бураўкіна, кіраўніка БНФ Зянона Пазьняка ды шэрагу іншых асобаў. Ф. Бартуль, жывучы з Злучаных Штатах, працягваў трымаць сувязь зь беларускай грамадой у Вялікабрытаніі, падтрымліваў Беларускую Грэка-Каталіцкую царкву і біскупаў Б. Слосканса, Ч. Сіповіча, і а. А. Надсана. У памешканьні Фундацыі імя Крэчаўскага жылі зь ягонага дазволу новапрыбылыя маладыя беларусы, адбываліся сходы Нью-Ёркага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). Францішь Бартуль заўсёды адгукаўся на просьбы аб дапамозе, быў шчырым і адкрытым чалавекам, заўсёды таварыскім і прыязным, з добрым пачуцьцём гумару.

Памёр Францішь Бартуль 4 сьнежня 2005 году і быў пахаваны на беларускіх могілках у горадзе Іст-Брансўік, штат Нью-Джэрзі.

**Віталь ЗАЙКА**

706_632.qxd 12/1/2024 10:28 AM Page 1 (1,1)



## Перамога Рэспубліканскай партыі

*заканчэньне з бач. 2*

най занятасьці і ўзроўню прыбыткаў працуючых. Ёсьць падставы спадзявацца, што гэта зможа зрабіць і Трамп-47. Задача досыць цяжкая – палітычныя і грамадзкія апанэнты будуць хапаць за ногі на кожным кроку, можна ўявіць, што кожны супрацоўнік адміністрацыі маладзей за 50 год – натуральна ёсьць патэнцыйным “падпольшчыкам” і “змагаром супраць аранжавай тыраніі”, прамарынаваўшыся ў сучаснай сыстэме вышэйшай (лявацкай – а іншай няма) адукацыі.

Нажаль, па абодва бакі сёнешняга палітычнага пазелу назіраецца ўзаемнае непрыняцьце, нядзольнасьць і неахвота да дыялёгу, а часам проста лютая нянавісьць да сваіх суайчыньнікаў з іншымі палітычнымі поглядамі. Нажаль, часам прадказаньні сяготага з аналітыкаў і камэнтатараў пра непазьбежнасьць новай грамадзянскай вайны ў ЗША выглядаюць даволі падобнымі на праўду. Такі канфлікт стаў бы найвялікшай трагедыя ня толькі для Амэрыкі, але і для ўсяго сьвету, выклікаў бы ланцуговую рэакцыю па ўсёй плянэце і найверагодней адкінуў бы яе на тысячу годоў назад, у “цёмныя стагодзьдзі”.

Найбольшыя засьцярогі для аўтара гэтых радкоў выклікае зьнешняя палітыка Дональда Трампа, а дакладней – адносіны з Пуцінам і абыякавасьць да лёсу Украіны. Хочацца спадзявацца, што гэта проста непрадуманая часовая пазыцыя, якую ў бліжэйшыя дні й тыдні выправяць кампэтэнтныя дарадцы і экспэрты ў новай адміністрацыі. На лёс Украіны завязаная будучыня нашай Бацькаўшчыны-Беларусі, а таксама ўсяго ўсходнеэўрапейскага рэгіёну. Менавіта цяпер аслабленая, перанапружаная Расея, рэжым якой за брытву хопіцца, каб застацца пры ўладзе – стала б для здольнага палітыка-прарока калібру Чэрчыля ці Бісмарка мажлівасьцю дабіцца справядлівага міру са спыненьнем братазабойчай вайны і захаваньнем тэрытарыяльнай цэласьці Украіны. Нажаль, спадзявацца на тое, што такім палітыкам-прарокам будзе Дональд Трамп, падставаў дужа мала, хоць і не сказаць, што зусім няма.




Абедзьве паловы краіны шмат што падзяляе. Але таго, што лучыць – значна болей, і менавіта на гэтым мусіць засяродзіцца як новая прэзыдэнцкая адміністрацыя, так і грамадзтва ў цэлым. Толькі кампрамісы і арыентацыя на вышэйшыя за палітыку прынцыпы мусяць быць мэтадамі апэраваньня абедзьвух палітычных партыяў, усіх палітычных і грамадзкіх сілаў. Гэта выглядае казкай, але чалавеку натуральна хочацца верыць у лепшае. Што ж датычыць нас, беларусаў у Амэрыцы і на Бацькаўшчыне, тут асаблівых зьменаў няма, кансалідацыя, імкненьне да каардынацыі й яднаньня застаюцца галоўнымі пунктамі на парадку дня. Адміністрацыя Трампа будзе зацікаўленая ў Беларусі яшчэ менш, чым адыходзячая адміністрацыя, таму спадзявацца можна толькі на сябе, на свае ўласныя сілы. Калі паверым у сябе, тады і зможам, і пераможам.

**Віталь ЗАЙКА**




## Запрашаем набываць

**літаратурны альманах беларускіх пісьменьнікаў замежжа “БЕЛАРУС” за 2024 год,**

Падтрымайце аўтараў і выдаўцоў сваёй зацікаўленасьцю.

Кошт сёлетняга нумару з дасылкаю ў межах ЗША **$24**, у Канаду і краіны Эўропы **$25**. Дасылка ў Беларусь, Украіну й Расею сёньня, нажаль, немагчымая.

Замовы, калі ласка, дасылайце поштаю на адрас:

***Marat Klakotski***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735.***

Чэкі выпісвайце на імя рэдактара і выдаўца ***Marat Klakotski***.

Новы выпуск альманах “Беларус” можна таксама замовіць на ўэб-сайце *e-krama.com*. Там жа можна набыць і ўсе папярэднія нумары альманаха, пачынаючы ад 2007 году, а таксама некаторыя беларускія кнігі і каляндар Згуртаваньня “Пагоня”.

**Уплаты ў Згуртаваньне шліце на адрас:**
***P. O. Box 572***
***New York, NY 10113***
**Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя скарбніка *Viktar Yedzinovich.***

Аб імпрэзах, якія ладзіць Беларуска-Амэрыканскае Згуртаваньне “Пагоня”, а таксама пра іншыя бягучыя падзеі ў жыцьці арганізацыі і беларускай грамады Нью-Ёрку можна даведацца наведаўшы старонку “Пагоні” ў Фэйсбуку:

***https://www.facebook.com/groups/ 134811029970802/***